# АДЗІНСТВАМ МОЦНЫЯ

**БАРАНАВІЧЫ. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэат Прэміі імя А. І. Дубко, паэтэса Таццяна Яцук (Навагрудскі раён) прыняла ўдзел у мерапрыемстве, прысвечаным самаму маладому дзяржаўнаму святу Рэспублікі Беларусь – Дню народнага адзінства.**




Да Дня народнага адзінства ў 1-й Гарадской бібліятэцы г. Баранавічы адбылася творчая сустрэча пад назвай «Адзінствам моцная Беларусь». Ганаровымі гасцямі сустрэчы з навучэнцамі Баранавіцкага каледжа тэхналогіі і дызайна сталі Таццяна Яцук, педагог, паэтэса, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэат Прэміі імя А. І. Дубко, кіраўнік літаратурнага аб’яднання «Купальскія зоры», а таксама Ігар Кошаў, старшыня Баранавіцкай раённай арганізацыі «Патрыёты Беларусі», Галіна Бабонава, салістка народнага клуба «Беспокойные сердца», лаўрэат шматлікіх творчых конкурсаў вакалістаў. Сустрэча, арганізаваная бібліятэчнымі спецыялістамі, прайшла на адзіным дыханні і пакінула ў прысутных незабыўны след.

## Тэлеграм-канал «Барановичи читающие»

**На фота:** сярод удзельнікаў творчай сустрэчы пад назвай «Адзінствам моцная Беларусь» член СПБ, паэтэса Таццяна Мікалаеўна Яцук. Верасень 2025 года.








